# «ВАЖНА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета на палях Мінскай вобласці сфарміраваўся нядрэнны ўраджай. Рэгіён будзе забяспечаны неабходнай колькасцю збожжа, а насельніцтва — якаснымі прадуктамі. Добрая ўраджайнасць спрыяе з'яўленню перадавікоў на жніве. А тое, што першыя тры тысячы тон збожжа сабралі на айчыннай тэхніцы, сведчыць, што беларускія камбайны пераўзыходзяць імпартныя аналагі.

## АД СВІТАННЯ ДА ЦЯМНА

Цяпер у аграрыяў няма часу на вялікія перапынкі. Ва ўмовах сюрпрызаў надвор'я механізатары цэняць кожную хвіліну. Таму на віншаванне першых трохтысячнікаў Васіля Зура і Сяргея Максімца было адведзена пяць хвілін. Паціснулі рукі і зноў за штурвал.

Працоўны стаж у экіпажа на дваіх чалавек амаль паўстагоддзя. Лідары хлебнай нівы разумеюць адзін аднаго з паўслова. Адсюль і вынікі. На іх камбайне ёсць фірмовае лога «МакЗур» — складзенае з прозвішчаў. У полі зорны экіпаж бачны здалёк.

На гомельскім камбайне аграрыі працуюць не першы сезон. «Без паломак не бывае, але па-хуткаму ўстараняем іх. Галоўнае, спакойным быць. Калі нервавацца, то і вынікаў вялікіх і не будзе», — лічыць Сяргей Максімец.

«Сёлета мы ўжо ўзялі трохтысячны рубеж, аднак на дасягнутым спыняцца не збіраемся. Многае залежыць ад надвор'я. Спадзяёмся, што яно і далей будзе спрыяць нам. Ды з тэхнікай праблем няма. Магутныя і надзейныя — беларускія камбайны без праблем дазваляюць браць новыя вышыні», — дадаў камбайнер.

Сяргей Максімец працуе на айчынным камбайне трэці сезон. І столькі ж радуе прадпрыемства ўдалымі вынікамі па ўборцы. «Тэхніку трэба берагчы, любіць і своечасова абслугоўваць. А так няма ніякага сакрэту — важна проста любіць сваю справу», — сказаў ён.

Уборачная кампанія — час надзвычайнай адказнасці. Нярэдка камбайнеры працуюць на палях ад світання да захаду сонца. «На жаль, з-за такой загружанасці не заўсёды паспяваю зрабіць усе хатнія справы... Але сям'я ставіцца да гэтага з разуменнем, а гэта — самае галоўнае», — адзначыў Сяргей Максімец.

## ЧАТЫРЫ ЎМОВЫ ДЛЯ РЭКОРДУ

Кожная ўзятая тысяча — падстава для гонару. І кожны такі рубеж не застаецца незаўважаным. Камбайнераўтысячнікаў падтрымліваюць грашовымі прэміямі і прыемнымі падарункамі. Сяргею Максімцу ААТ «Гомсельмаш» сёлета падарыла новы тэлевізар. Падтрымлівае і роднае прадпрыемства.

«Зладжаная праца, надвор'е і ўраджайнасць, — пералічвае ўмовы для сваіх перамог памочнік камбайнера Васіль Зур. — Ураджай у параўнанні з мінулым годам вышэй».

Чацвёртая ўмова — тэхніка. Памочнік камбайнера расказаў пра зручнасці на борце сваёй машыны: «Тут ёсць халадзільнік, боксы для халодных і гарачых прадуктаў, лічбавы камп'ютарны манітор, на якім можна адсочваць неабходныя працэсы. Бачна страты пры ўборцы, няспраўныя элементы камбайна. Для змазкі машыны ёсць цэнтралізаваная сістэма. Усё аўтаматызавана, і гэта палягчае працу камбайнера і яго памочніка. Але асабісты кантроль, вядома, патрэбны».

Камбайнер павінен любіць сваю працу, пагаджаецца з напарнікам Васіль Зур. «Трэба акуратна і беражліва ставіцца да тэхнікі і ведаць яе. Без гэтага проста ніяк. Першапачаткова я працаваў зусім на іншай машыне, але з вопытам перасаджваўся на камбайны ўсё больш высокага класа. За больш чым чвэрць стагоддзя прапрацаваў на самай рознай тэхніцы, таму мне ёсць з чым параўнаць», — кажа ён.

Васіль Зур дадае: «Мне падабаецца працаваць на зямлі. Вядома, мы з напарнікам спадзяёмся, што на такім выніку не спынімся — будзем ісці далей і далей».

**Старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сяргей ПРЫМАЧЭНКА**, які наведаў Дзяржынскі раён з прыемнай місіяй — павіншаваць лідараў жніва, — пажадаў таго ж: «Жадаю, каб гэта быў не апошні ваш рубеж».

Сяргей Прымачэнка заўважыў, што ў гэтым годзе ў Беларусі была «афрыканская» спякота, больш за 66-69 дзён па многіх рэгіёнах стаяла засуха. «Адпаведна, мы выдатна разумелі, што сёлета павінны атрымаць ураджай і ўсё для гэтага зрабіць. Сёння ўжо перасягнулі мяжу ў 50 працэнтаў. (29 ліпеня. — Аўт.). Мы не павінны супакойвацца. Прырода можа падаваць нам пэўныя сюрпрызы. Таму кожная хвіліна і кожная гадзіна вельмі дарагі», — сказаў ён.

Сяргей Прымачэнка адзначыў, што задача ўладаў — цалкам забяспечыць камбайнераў усімі неабходнымі матэрыяламі. Калі камбайн зламаўся, аператыўна павінна прыехаць група, каб ліквідаваць непаладку. У гэты час камбайнеры могуць адпачыць або паабедаць. «Камбайн заўсёды застаецца на палях — перагоны максімальна выключаны. Мы разумеем, што нагрузка на іх істотная — больш за 300 гектараў сёлета. Дарэчы, па Мінскай вобласці па збожжавых ужо перасягнулі мільён тон», — паведаміў ён.

Да віншавання перадавікоў далучыліся намеснік старшыні Дзяржынскага раённага выканаўчага камітэта Вольга Ігнатава, старшыня прафсаюза АПК Раіса Смяян і кіраўнік гаспадаркі Юрый Клімаш. У той жа дзень рэкорд устанавілі не толькі Сяргей Максімец і Васіль Зур, але і вадзіцель сельскагаспадарчага прадпрыемства Вадзім Агароднікаў, які перавёз 2000 тон збожжа. Атрымаўшы каштоўныя ўзнагароды, работнікі адразу вярнуліся да жніва — разгар сезона расслабляцца не дае.

## «СЯМ'Я НАТХНЯЕ»

Прыкладна ў той жа час у Клецкім раёне вызначыўся малады кіроўца-трохтысячнік **Андрэй АЛЯКСЕЙЧЫК з ААТ «Кухчыцы»**. Усяго на ўборачнай у вобласці працуюць каля 340 маладых вадзіцеляў, якія ажыццяўляюць транспарціроўку збожжавых і зернебабовых культур з палёў.

Стаж Андрэя Аляксейчыка ў гаспадарцы 12 гадоў. Ён пачаў сваю прафесійную дзейнасць з моманту атрымання пасведчання кіроўцы. На дадзены момант перавёз ужо больш 3536 тон збожжавых і зернебабовых культур.

З дзяцінства Андрэй захапляўся тэхнікай, ды і перад вачыма быў прыклад дзеда-трактарыста. Таму, калі прыйшоў час выбіраць прафесію, вырашыў стаць кіроўцам. «І, ведаеце, ні разу не пашкадаваў. Дарэчы, я не ўпершыню ўдзельнічаю ў конкурсе ад БРСМ «Моладзь — за ўраджай!». Некалькі гадоў таму ўжо станавіўся пераможцам. Гэта вельмі адказна і ганарова», — падзяліўся ён.

Традыцыйна праект «Моладзь — за ўраджай!» праходзіць ва ўсіх рэгіёнах краіны ў перыяд уборачнай кампаніі. Яго ўдзельнікамі з'яўляюцца маладзёжныя ўборачныя экіпажы камбайнераў і маладыя вадзіцелі транспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць перавозку збожжавых і зернебабовых культур. Адметная асаблівасць іх тэхнікі — стылізаваная налепка з лагатыпам праекта. Спаборніцтвы праходзяць у дзвюх намінацыях: «Маладзёжны экіпаж камбайнераў, які дасягнуў найбольшага намалоту» і «Малады вадзіцель, які перавёз найвышэйшую колькасць збожжавых і зернебабовых культур».

У сезон уборачнай Андрэй Аляксейчык з'яўляецца дома рэдка. Жартуе, што прыходзіць толькі пераначаваць, але сям'я ставіцца да гэтага з разуменнем. «Мяне чакаюць жонка і дзве дачкі. Яны ўжо прывыклі, што летам мяне амаль не бачаць. Калі знаходжуся ў полі, пастаянна пра іх думаю. Яны натхняюць мяне на рэкорды», — дадаў ён.

Першым павіншаваў працаўніка **старшыня Клецкага раённага выканаўчага камітэта Юрый КАРЛОВІЧ**.




«Планету рухаюць маладыя, — падкрэсліў кіраўнік раёна. — І ўдвая прыемна сёння, што лепшы малады вадзіцель нашай рэспублікі працуе ў нас. Для нас ён — найлепшы ва ўсім свеце».

Ключавыя фактары, якія вызначаюць поспех Андрэя — адданасць працы і неверагодная ўпартасць. Ён не толькі імкнецца да выканання сваіх абавязкаў, але і пастаянна ўдасканальвае свае навыкі, вывучаючы асаблівасці тэхнікі і метады аптымізацыі працэсу перавозкі грузаў.

Калега Андрэя **кіроўца Вячаслаў КАПЫЦІЧ** у гаспадарцы працуе ўсяго чатыры месяцы. Да гэтага працаваў кіроўцам на малой радзіме ў Івацэвіцкім раёне. А потым пераехаў у Клецкі ўслед за дзяўчынай, якая атрымала размеркаванне ў «Кухчыцы». У новым калектыве яго прынялі цёпла, прызнаецца Вячаслаў. На дадзены момант ён перавёз 2892,6 тысячы збожжавых і зернебабовых культур.

«За некалькі месяцаў адаптаваўся. З самага пачатку ўпарта імкнуўся стаць адным з лідараў. І ў мяне атрымалася! Тут усё проста: трэба любіць тое, што робіш, і цалкам аддавацца сваёй працы. А больш ніякіх сакрэтаў няма. Галоўнае, каб машына не падводзіла. Дарэчы, мой бацька таксама кіроўца. Яго прыклад заўсёды натхняў мяне. На дасягнутым спыняцца не збіраюся: хацелася б па выніках уборачнай стаць найлепшым у краіне», — прызнаўся Вячаслаў Капыціч.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіва Сяргея Максімца і з тэлеграм-канала Мінская вобласць/Пра галоўнае.**
*Дзяржынскі раён.*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Міністры абароны ЗША, Японіі і Паўднёвай Карэі падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве



Кіраўнік Пентагона Лойд Осцін, а таксама міністры абароны Японіі і Рэспублікі Карэя Мінору Кіхара і Сін Вон Сік падпісалі ў Токіа мемарандум у рамках пагаднення аб трохбаковым супрацоўніцтве ў галіне бяспекі. Пра гэта паведамляецца ў заяве, распаўсюджанай амерыканскім ваенным ведамствам, паведаміла ТАСС. Мемарандум быў падпісаны на трохбаковай сустрэчы кіраўнікоў ваенных ведамстваў. На ёй таксама былі абмеркаваны агульныя праблемы ў сферы бяспекі, паведамілі ў Пентагоне. У прыватнасці, міністры выказалі занепакоенасць супрацоўніцтвам Пхеньяна з Масквой і падпісаннем Дагавора аб усеабдымным стратэгічным партнёрстве паміж РФ і КНДР.

### У Філадэльфіі прайшоў першы з'езд «Рэвалюцыйных камуністаў Амерыкі»




Першы з'езд партыі «Рэвалюцыйныя камуністы Амерыкі» адбыўся ў Філадэльфіі (штат Пенсільванія). Пра гэта партыя паведаміла ў сацсетцы, перадае ТАСС. Як вынікае з размешчаных у акаўнце паведамленняў і відэазапісаў, пасля завяршэння мерапрыемства каля 500 прыхільнікаў партыі выйшлі на вуліцы горада. Удзельнікі дэманстрацыі пранеслі чырвоныя сцягі з сярпом і молатам, скандзіруючы розныя лозунгі, сярод якіх «Даеш класавую барацьбу ў 2024-м!». Партыя была створана ў пачатку 2024 года. Як адзначаецца ў праграме, яе мэта — «ліквідацыя капіталізму ў ЗША, барацьба з вайной, няроўнасцю, прыгнётам», а таксама пераход улады ў краіне ў рукі рабочага класа.

### У Вялікабрытаніі ў выніку нападзення з нажом загінулі тры дзяўчынкі



Сама меней трое дзяўчынак загінулі пасля нападзення з нажом на дзіцячы танцавальны клуб, якое адбылося ў брытанскім горадзе Саўтпарт, што знаходзіцца непадалёк ад Ліверпуля на поўначы Вялікабрытаніі. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». 9-гадовая дзяўчынка пайшла з жыцця ўчора ў бальніцы. Дзве іншыя дзяўчынкі, шасці і сямі гадоў, памерлі ад нажавых раненняў 29 ліпеня. Пяць параненых дзяцей знаходзяцца ў крытычным стане. Акрамя таго, з цяжкімі раненнямі ў клініцы яшчэ двое дарослых. Па падазрэнні ў здзяйсненні нападзення ў Саўтпарце арыштаваны 17-гадовы малады чалавек, які жыве ў суседнім горадзе Бэнкс. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Кір Стармер назваў нападзенне «насамрэч жахлівым».